ДЗЯРЖАВА І ДЫЯСПАРА
ПАТРЭБНЫ РАЗУМЕННЕ І ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ 2 стар.
ШМАТГАЛОССЕ
ЯНЫ З БЕРАГОЎ ВОЛГІ 5 стар.
ПЕРСПЕКТЫВЫ
СІСТЭМА «ЯМАЛ — ЕЎРОПА» ПАВЯЛІЧЫЦЬ ТРАНЗІТ ГАЗУ Ў ТРЫ РАЗЫ 2 стар.

У МАЛАДЗЕЧНЕ АДБЫЛОСЯ ЎРАЧЫСТАЕ АДКРЫЦЦЁ ПОМНІКА СЛЫННАМУ СЫНУ БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ, ДЗЯРЖАЎНАМУ І ГРАМАДСКАМУ ДЗЕЯЧУ, КАМПАЗІТАРУ, АЎТАРУ НЕЎМІРУЧАГА ПАЛАНЕЗА «РАЗВІТАННЕ З РАДЗІМАЙ» Міхалу Клеафасу АГІНСКАМУ. ПРА ГЭТА Ў НАТАТКАХ Яўгена ЛЕЦКІ НА 4-5 старонках

Сакрат ЯНОВІЧ (Польшча) «ЗАПІСЫ ВЕКУ» (працяг) 7 стар.
ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ: РАСІЯ, УКРАІНА, ЗША, ЛАТВІЯ 6 стар.
ВАНДРОЎНЫЯ БЫЛІ
СТОПАМ НА БРАНІ 8 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ

Голас Радзімы

7 лістапада 2001 года
Цана 117 рублёў

№ 45 (2759)
E-mail: golas_radzimy@tut.by

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі
Выдаецца з 6 красавіка 1955 года

ТОЛЬКІ ФАКТ

БЕЛАРУСЬ АБРАНА Ў ВЫКАНАЎЧЫ САВЕТ ЮНЕСКА

Падчас 31-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА адбыліся выбары ў Выканаўчы савет гэтай арганізацыі.

Наша краіна была сярод васьмі дзяржаў Цэнтральна-Усходнееўрапейскай выбарчай групы — Албаніі, Азербайджана, Арменіі, Латвіі, Славакіі, Украіны, Югаславіі, што прэтэндавалі на тры вакантныя месцы. Членамі Выканаўчага савета сталі Беларусь, Славакія і Украіна.

Падтрымка дзяржавамі-членамі ЮНЕСКА кандыдатуры Беларусі адлюстроўвае прызнанне яе ўкладу ў дзейнасць Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры.

Павел ЛАТУШКА,
начальнік упраўлення інфармацыі,
прэс-сакратар МЗС Беларусі.

САЮЗНЫЯ ВЫБАРЫ

Законапраекты аб выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў парламента Саюзнай дзяржавы першага склікання могуць быць прыняты парламентамі Расіі і Беларусі ў снежні.

Пасля гэтага кіраўнікі дзвюх дзяржаў змогуць прызначыць канкрэтную дату выбараў у парламент Саюзнай дзяржавы. Што тычыцца беларускага законапраекта, ён актыўна дапрацоўваецца да другога чытання.

Ірына САВЕТКІНА.

"БЕЛПОШТА" ПЕРАЙШЛА НА ЎЗМОЦНЕНЫ РЭЖЫМ БЯСПЕКІ

Рэспубліканскае аб'яднанне "Белпошта" перайшло на ўзмоцнены рэжым бяспекі ў сувязі з распаўсюджаннем у свеце сібірскай язвы.

Як паведаміла намеснік генеральнага дырэктара прадпрыемства Ніна Юшкевіч, штодзённа ў аб'яднанне практычна з усіх краін свету паступае ад 2 да 2,5 тоны пісьмаў. Усе супрацоўнікі, якія маюць дачыненне да ўваходнай і выходнай пошты, прайшлі інструктаж і цяпер працуюць у сродках індывідуальнай засцярогі. Пры гэтым, падкрэсліла Ніна Юшкевіч, нельга казаць, што "Белпошта" цалкам застрахавана ад гэтай "заразы".

Андрэй ШМЫГІН,
БелТА.

ПАДЗЕЯ

БЕЛАРУСКАМУ ДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТУ – 80...

● **Віктар МАЦЮШЭНКА.**

Рашэнне аб заснаванні Беларускага універсітэта ў Мінску было прынята ўрадам Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь 25 лютага 1919 года. Аднак адкрыццю універсітэта перашкодзіла часовая акупацыя Мінска польскімі войскамі. Толькі вясною 1921 года ЦВК ССРБ пацвердзіў свой ранейшы намер. Адразу ж быў аб'яўлен прыём студэнтаў на рабочы факультэт і падрыхтоўчыя курсы.

Сярод выкладчыкаў універсітэта некалі былі народны пісьменнік Беларусі Я. Колас і будучы маршал Савецкага Саюза Г. Жукаў. У розны час універсітэт закончылі вядомыя беларускія паэты і пісьменнікі П. Глебка, К. Крапіва, П. Броўка. 80 працэнтаў супрацоўнікаў Нацыянальнай Акадэміі навук складаюць выпускнікі БДУ. Без перабольшвання можна сказаць, што аснова нацыянальных кадраў у народнай гаспадарцы, навуцы і адукацыі падрыхтавана менавіта Беларускім дзяржаўным універсітэтам.

Зараз ва універсітэце 16,3 тысячы студэнтаў, 710 аспірантаў і 25 дактарантаў. Штогод на факультэтах вучацца ці праходзяць стажыроўку каля 500 замежных грамадзян з 40 краін свету.

На агульных умовах універсітэт прымае на вучобу этнічных беларусаў — прадстаўнікоў беларускай дыяспары. Зараз тут навучаюцца 33 нашыя суродзічы з Казахстана, Латвіі, Літвы, Малдовы, Расіі, Туркменістана, Узбекістана, Украіны. Вывучаюць, у асноўным, фізіка-матэматычныя навукі і юрыспрудэнцыю.

У сценах Беларускага дзяржаўнага універсітэта жыве дух старажытнай беларускай Alma mater, які захаваўся з часоў славутага Полацкага калегіума і Віленскага універсітэта.

НА ЗДЫМКАХ: кастрычнік — час юбілейных мерапрыемстваў Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Адно з іх — адкрыццё помніка Кірылу Тураўскаму ва Універсітэцкім гарадку.

Фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

СПОРТ

БАСКЕТБОЛ. 26 лістапада мужчынская нацыянальная зборная Беларусі па баскетболу матчам супраць французаў на сваёй пляцоўцы пачне адборачны турнір да чэмпіянату Еўропы. Адбудзецца гэтая гульня на новым памосце ў мінскім Палацы спорту. Новае баскетбольнае абсталяванне набыла федэрацыя ў адной з фінскіх фірм.

СУМО. На чэмпіянаце Еўропы па сумо, які праходзіў у галандскім горадзе Арнеме, нашы землякі заваявалі два медалі. Сярэбраная ўзнагарода ў катэгорыі звыш 80 кілаграмаў дасталася Вераніцы Казлоўскай. А залаты медаль у абсалютнай вагавай катэгорыі ва ўпартым паядынку заваяваў Вячаслаў Пірскі.

Новая зала сілавой атлетыкі абсталявана ў Лядовым палацы Брэста. Тут звыш ста ўсемагчымых трэнажораў. І займацца ў гэтай зале могуць не толькі прафесійныя спартсмены, але і ўсе жадаючыя.

Фота **Рамана КАБЯКА**, БелТА.

НАПЯРЭДАДНІ

ЧАКАЕМ «ЛІСТАПАД»

Для сталічных аматараў кіно восень — гэта чаканая сустрэча з фільмамі чарговага Міжнароднага кінафестывалю краін Садружнасці і Балтыі "Лістапад-2001", які пройдзе з 23 па 29 лістапада 2001 года ў Мінску ў кінатэатры "Кастрычнік".

Фестываль "Лістапад" стаў часткай культурнага жыцця Беларусі і арганічна ўпісаўся ў міжнародны фестывальны рух. Ён адкрыецца фільмам "Прыходзь на мяне паглядзець" — дэбютам у рэжысуры вядомага акцёра Алега Янкоўскага, які зрабіў карціну разам з рэжысёрам Міхаілам Аграновічам. Сярод іншых фільмаў конкурснага паказу: "Павадыр" А. Яфрэмава (Беларусь), "Брэменскія музыканты" А. Абдулава, "Яды, ці Сусветная гісторыя атручванняў" К. Шахназарава і іншыя.

Акрамя конкурсных стужак у сталічным кінатэатры "Перамога" будуць прадстаўлены пазаконкурсныя.

Сярод гасцей і ўдзельнікаў фестывалю ўжо не ў першы раз будуць прадстаўнікі Літвы, Латвіі, Украіны, Расіі, Узбекістана, Беларусі. Упершыню пакажуць свае фільмы Францыя, Японія, Кыргызстан.

Трэці год у рамках "Лістапада" праводзіцца фестываль кінафільмаў для дзяцей "Лістападзік", дзе да ўдзельнікаў далучацца кінематаграфісты Кітая і Чэхіі.

Беларускі саюз кінематаграфістаў сумесна з Тэатрам-студыяй кінаакцёра правядзе тэатральны конкурс, у якім, дарэчы, возьме ўдзел прэм'ерны спектакль "Поле бітвы" беларускага драматурга Святланы Бартохавай.

Таццяна КУВАРЫНА.

КОРАТКА

● *Сёння ў Магілёве завяршаецца традыцыйны фестываль мастацтваў "Залаты шлягер".*

● *У Доме дружбы ў Мінску адбылася сустрэча з актывістамі аўстрыйскага таварыства "Дапамога дзецям Беларусі".*

● *Настаўнікі Беларусі правялі свой другі з'езд.*

● *У Мінску на стадыёне "Дынама" прайшла футбольная гульня паміж зоркамі эстрады Беларусі і Расіі і ўдзельнікамі каманды Клуба вясёлых і знаходлівых Белдзяржуніверсітэта.*

Падрыхтавала **Алена РУДЗЬ.**

ПЕРСПЕКТЫВЫ

СІСТЭМА «ЯМАЛ — ЕЎРОПА»

ПАВЯЛІЧЫЦЬ ТРАНЗІТ ГАЗУ Ў ТРЫ РАЗЫ

Газ у штодзённым жыцці стаў настолькі звыклай з'явай, што мы нават не ўяўляем, якім складаным шляхам трапляе ён у нашы кватэры, на прадпрыемствы, у газавыя балоны аўтатранспарту. А забяспечвае гэтую стабільнасць прадпрыемства "Белтрансгаз".

Калі б была магчымасць зірнуць на нашу Беларусь з космасу, мы б убачылі магутную артэрыю, што пралегла ад усходніх да заходніх межаў, і бясконцую колькасць трубаправодаў у розныя бакі: на Гомельшчыну і Віцебшчыну, Магілёўшчыну і Гродзеншчыну — амаль шэсць з паловай тысяч кіламетраў газаправодаў. Іх працу забяспечвае 201 газаразмеркавальная станцыя, 17 кампрэсарных цэхаў і шэсць газавымяральных станцый.

Стабільнасць газавых патокаў падтрымліваюць Асіповіцкае і Прыбужскае падземныя газасховішчы. Уся гэтая складаная гаспадарка ў мінулым годзе забяспечыла пастаўку 16,5 мільярда кубічных метраў газу Беларусі і звыш 25 мільярдаў — транзіт на Украіну, у Польшчу, Літву, Калінінградскую вобласць.

Новыя перспектывы адкрывае будаўніцтва трансканты-нентальнай газавай сістэмы "Ямал — Еўропа", што пройдзе па тэрыторыі Беларусі і павялічыць транзіт газу ў 2,5—3 разы. Ужо дзейнічаюць 209 кіламетраў беларускай часткі гэтага газаправода, які працягнуўся ад заходняй мяжы краіны да Нясвіжа. Тут пачала дзейнічаць адна з пяці плануемых кампрэсарных станцый.

Кампрэсарная станцыя "Нясвіжская" забяспечана тэхналагічным абсталяваннем, якое адпавядае сусветным стандартам надзейнасці, эканамічнасці і бяспекі.

НА ЗДЫМКАХ: бездакорную працу станцыі забяспечвае начальнік вытворча-дыспетчарскай службы Уладзімір МАРЧУК; устаноўкі ахаладжэння газу пасля павышэння яго ціску; кампрэсарная станцыя "Нясвіжская" газаправода "Ямал — Еўропа" зроблена па сусветных стандартах.

Тэкст і фота
Яўгена КАЗЮЛІ.



ДЗЯРЖАВА І ДЫЯСПАРА

ПАТРЭБНЫ РАЗУМЕННЕ І ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ

Пасольства Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Малдова з улікам думак Каардынацыйнага савета беларускіх абшчын у Малдове лічыць неабходным унесці канкрэтныя прапановы па ўдасканальванню ўзаемадзеяння дзяржавы і дыяспары

На нашу думку, дзяржаўная палітыка пашырэння і паглыблення шматбаковых сувязей і супрацоўніцтва з сусветнай супольнасцю, асаблівасці сучаснага этапу сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі патрабуюць пераасэнсавання і пэўнай карэкціроўкі існуючых сувязей з суайчыннікамі, што пражываюць за мяжой. Узровень гэтых сувязей не ў поўнай ступені адпавядае інтарэсам беларускага грамадства і яго дзяржаўных інстытутаў, якія толькі часткова выкарыстоўваюць вялікі патэнцыял і магчымасці дыяспары ў краінах пражывання, а таксама патрэбам саміх дыяспар.

Дзяржавы-суседзі Беларусі зараз праводзяць больш актыўную палітыку ў адносінах да сваіх суайчыннікаў. Практыка такога роду дзейнасці з'яўляецца агульнапрызнанай і агульнапрынятай ва ўсім свеце.

Між тым, узровень дзяржаўнага супрацоўніцтва з беларускай дыяспарай з'яўляецца ў многіх адносінах толькі фіксуючым паказчыкам.

На наш погляд, дыяспара замежжа сёння можа садзейнічаць:

— замацаванню аўтарытэту беларускай дзяржавы, аб'ектыўнаму інфармаванню сусветнай супольнасці пра працэсы дзяржаўнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага будаўніцтва ў Беларусі;

— захаванню беларускай прысутнасці ў свеце — беларусаў замежжа як часткі беларускай нацыі.

На наш погляд, для дасягнення згаданых мэт у працы з беларускай дыяспарай Рэспублікі Малдова неабходна рэалізаваць наступнае.

У інфармацыйным плане:

— забяспечыць беларускія абшчыны і этна-культурныя суполкі ў гарадах Кішынёў, Бельцы, Цірасполь і Бендэры неабходнай колькасцю беларускіх дзяржаўных газет;

— для арганізацыі ў гарадах Бельцы, Бендэры і камплектацыі ўжо існуючых у Кішынёве і Цірасполі бібліятэк, што дзейнічаюць пры беларускіх абшчынах, штогод выдзяляць не менш як 100 экземпляраў мастацкай, гістарычнай, нацыянальна-культурнай літаратуры на кожную абшчыну;

— аднаму з беларускіх выданняў аказаць арганізацыйную і фінансавую дапамогу ў выданні газеты беларускай дыяспары ў Малдове;

— штогод праводзіць тыдзень беларускага тэлебачання на тэлебачанні Малдовы.

У адукацыйнай сферы:

— забяспечыць неабходнымі падручнікамі і навучальнымі дапаможнікамі па гісторыі Беларусі, беларускай мове і літаратуры нядзельныя школы для дзяцей этнічных беларусаў;

— прадугледзець штогадовую стажыроўку выкладчыкаў згаданых нядзельных школ у Беларусі;

— арганізоўваць штогод для дзяцей этнічных беларусаў — выпускнікоў школ бясплатныя падрыхтоўчыя курсы ў Беларусі з мэтаю адаптацыі да праграм беларускіх школ;

— прадугледзець парадак паступлення ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы Беларусі выпускнікоў — дзяцей этнічных беларусаў без устанаўлення квот;

— праводзіць штогадовае тэсціраванне абітурыентаў — дзяцей этнічных беларусаў з выездам выкладчыкаў у горад Кішынёў;

— вырашыць пытанні ўдзелу школьнікаў — дзяцей этнічных беларусаў у алімпіядах па розных прадметах, якія праводзяцца ў Беларусі, шырока практыкаваць экскурсіі вучняў у Беларусь у час школьных канікулаў.

У культурна-асветнай сферы:

— аказаць садзейнічанне беларускім абшчынам і этна-культурным таварыствам у стварэнні калектываў мастацкай самадзейнасці і забеспячэнні іх неабходнымі музычнымі інструментамі і нацыянальнымі касцюмамі;

— дапамагчы самадзейным мастакам і паэтам — этнічным беларусам ва ўдасканаленні прафесійнага майстэрства, устанаўленні сувязей з творчымі саюзамі Беларусі.

У галіне міграцыйных працэсаў:

паколькі ў апошнія гады асабліва востра паўстала праблема перасялення беларусаў Малдовы на этнічную Радзіму, патрабуюць вырашэння наступныя пытанні:

— спрашчэнне працэдуры атрымання грамадзянства;

— аказанне дапамогі ў працаўладкаванні і пасяленні на новым месцы, выдзяленні для ўладкавання неабходных мэтавых крэдытаў.

З улікам сённяшняй дэмаграфічнай сітуацыі ў Беларусі, асабліва ў сельскай мясцовасці, даныя патрабаванні цалкам абгрунтаваныя і іх можна выканаць.

У сферы гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва:

— прыняць адпаведныя рашэнні аб выдзяленні тавараў для прадпрыемстваў і арганізацый Малдовы і Прыднястроўя, якія ўзначальваюць этнічныя беларусы або грамадзяне, што аказваюць істотную матэрыяльна-фінансавую дапамогу беларускім абшчынам і этна-культурным таварыствам для забеспячэння іх статутнай дзейнасці, з растэрміноўкай плацяжоў ва ўстаноўленым заканадаўствам Беларусі парадку пасля прадастаўлення фінансавых і матэрыяльных гарантый з іх боку;

— дазволіць прадстаўнікам дыяспары адкрыццё рахункаў у банках Беларусі для канцэнтрацыі грашовых сродкаў ад прадпрымальніцкай дзейнасці і гуманітарнай дапамогі;

— дазволіць аплату пражывання ў гасцініцах прадстаўнікам дыяспар па цэнах, што выкарыстоўваюцца для грамадзян Беларусі.

Лічым таксама мэтазгодным:

— прыняць закон аб суайчынніках, якія пражываюць за мяжой і шэраг паправак, змяненняў і дапаўненняў у іншыя заканадаўчыя акты, якія б афіцыйна замацавалі статус суайчыннікаў, што пражываюць за мяжой, прадаставілі ім пэўныя льготы і перавагі;

— стварыць пры вышэйшым заканадаўчым органе Беларусі Савет суайчыннікаў, што пражываюць за мяжой, які б дзейнічаў пастаянна і мог выконваць функцыі экспертна-кансультацыйнага органа Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;

— паскорыць прыняцце дзяржаўнай праграмы "Беларусы ў свеце";

— з мэтаю абмену вопытам працы з дыяспарамі іншых краін СНД, Прыбалтыкі і далёкага замежжа ажыццяўляць практыку ўключэння кіраўнікоў дыяспар у дзяржаўныя дэлегацыі, што выязджаюць у камандзіроўкі па адпаведных накірунках;

— практыкаваць заахвочванне суайчыннікаў, якія працуюць на карысць Беларусі, а таксама ўзнагароджанне беларусаў замежжа дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь.

Думаем, што рэалізацыя выказаных прапаноў, а таксама выдзяленне для патрэб беларускіх суполак хаця б мінімальных сродкаў, будзе садзейнічаць паляпшэнню спраў на такім прыярытэтным накірунку дзейнасці знешнепалітычнага ведамства краіны, як праца з беларускай дыяспарай.

Васіль САКОВІЧ,
Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Малдова.

НЕЗАБЫЎНАЕ

Няма на нашай зямлі горада, мястэчка ці самай маленькай вёсачкі, якіх бы не кранула полымя вайны. Асаблівы боль выклікаюць месцы, дзе фашысцкія нелюдзі знішчалі ні ў чым невінаватых мірных жыхароў.

Ёсць такое месца і недалёка ад Століна, каля вёскі Манькавічы. Тут у 1941—1944 гадах фашысцкія каты знішчылі 12 тысяч мірных жыхароў століншчыны — дзяцей, жанчын, старых. З іх — каля васьмі тысяч яўрэяў. Шануючы памяць ахвяр, тут стварылі мемарыяльны комплекс, самы буйны ў раёне. Сюды прыходзяць тыя, каму пашанцавала выжыць у пекле вайны, дзеці, унукі і праўнукі загінуўшых. Прыходзяць, каб пакласці сціплыя кветкі і моўчкі пастаяць.

НА ЗДЫМКАХ: мемарыяльны комплекс ахвярам вайны каля вёскі Манькавічы Столінскага раёна.

Тэкст і фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

СІТУАЦЫЯ

ГУЧНАЯ СПРАВА

Слуханні па крымінальнай справе грамадзян Беларусі Валерыя Ігнатовіча, Максіма Маліка, Аляксея Гуза і Сяргея Саушкіна пачаліся 24 кастрычніка ў памяшканні Вярхоўнага суда. Яны абвінавачваюцца ў бандытызме, сямі наўмысных забойствах, разбойных нападах і іншых цяжкіх злачынствах.

У ліку іх і выкраданне апаратара беларускага бюро расійскай тэлекампаніі «ГРТ» Дзмітрыя Завадскага.

Супраць злачыннай групы следчымі органамі сабрана каля 50 тамоў матэрыялаў. Іх разгляд патрабуе шмат часу.

Працэс праходзіць у закрытым рэжыме.

НА ЗДЫМКУ: маці Дзмітрыя Завадскага Вольга ЗАВАДСКАЯ ідзе на суд.

Фота **Віктара ТАЛОЧКІ**, БелТА.

ЗДАРЭННІ

КАНФІСКАВАНА МАРЫХУАНА

У Талачыне а палове другой ночы супрацоўнікамі падраздзяленняў па незаконнаму абароту наркотыкаў і крымінальнага вышуку Аршанскага АУС канфіскавана вялікая партыя наркотыкаў.

Дурман знойдзены ў кватэры непрацуючага жыхара. Праваахоўнікамі канфіскавана 5 кілаграмаў 850 грамаў марыхуаны. Да таго ж у кватэры талачынца знойдзены тры пісталеты замежнай вытворчасці і 250 грамаў тратылу.

ГАСЦЁЎНЯ

Дзмітрый МІХЛЕЕЎ: «ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ КІНО – МАЗАІКА, дзе можа бліснуць і алмаз, і шкло»

— У фільме "Дыялог пра бульбу" ідэя такая: беларускія навукоўцы вывелі больш за дваццаць цудоўных сартоў бульбы, якія куплялі ГДР, Чэхаславакія, Балгарыя. А ў сябе ў калгасах беларусы "гоняць" адзін-два няважныя, але "танажныя" сарты. Чаму? А таму, што сартавой бульбай не адрапартуеш кожнай восенню аб адпраўцы ў Расію мільёна тон бульбы.

Мы тут закранулі дзяржаўную палітыку тых часоў. Нас выклікаў міністр сельскай гаспадаркі, запатрабаваў сцэнарый. Прачытаў старонкі тры, зразумеў, што мы задумалі, затупаў нагамі і прагнаў з кабінета. Потым тэлефанаваў дырэктару "Летапісу", патрабаваў закрыць фільм. Праўда, да закрыцця не дайшло, але крыві мы папсавалі шмат.

Падчас здачы запу забівалі чыноўнікі міністэрства, крычалі і пагражалі. Наша начальства старалася змякчыць ведамасны ціск, але фільм прымусілі перарабіць разоў шэсць, і ён выйшаў на экраны ўвесь такі абрэзаны-абшчыпаны...

Тады я пачуў даволі мудры афарызм: "Праблема праблемнага фільма — гэта праблема яго здачы".

— Здаецца, вы атрымалі з гэтай "бульбянай" гісторыі нейкі важны для сябе ўрок — мяркуючы па вашым тоне!

— Так. Я вырашыў не звязвацца са злабадзённымі праблемамі. Само паняцце "злоба дня" з таго часу стала для мяне агідным, як героі жахаў. Я зразумеў, што люблю здымаць дзяцей, жывёл, старых, значных, мудрых людзей — асоб.

Ніколі не здымаў "дваццатых памочнікаў Брэжнева", якія часта наведвалі Беларусь. Дык мне б і не даверылі. Для здымак "афіцыёза" ў нас былі калегі асобага складу: чыста паголеныя, у касцюмах-тройках і, канешне, — члены КПСС і нават райкама. Мне гэта было смешна. І вельмі шкада кіламетраў цудоўнай плёнкі "Кодак". Гэтыя кіламетры і сёння ляжаць недзе ў архівах, а колькі "бульбін" можна было на іх зняць!

Я быў далёкі і ад "кола паспяховых", і ад прэзентабельных партыйна-велікасвецкіх тусовак.

З часам мне растлумачылі, што, аказваецца, менавіта на такіх тусоўках і здабываліся новыя пастаноўкі, званні, паездкі за мяжу і іншыя даброты часоў застою. Паколькі даброты гэтыя мяне не хвалявалі, я аддаваў перавагу сяброўскім застоллям у майстэрнях мастакоў, шахматам, нечаканым паездкам за горад.

Калі мне не давалі працаваць, я ўспамінаў сваю старую прафесію і маляваў вокладкі зборнікаў вершаў, прозы. Удастоіўся нават праілюстраваць Івана Шамякіна — "Экзамен на восень". Фільмаў зняў параўнальна няшмат, у асноўным тыя, якія хацеў.

— Ваша праца прыносіла вам радасць ці была проста магчымасцю "зарабіць"!

— А хіба магчыма працаваць без радасці? Дакументалістыка дае магчымасць блізка пазнаёміцца і нават пасябраваць з найцікавейшымі людзьмі. Чаго варты той жа Іван Шамякін! А яго сябра, незабыўны Андрэй Макаёнак? Помню, ён гаварыў: "Калі пастроіць у шарэнгу Саюз пісьменнікаў Беларусі і даць каманду: "На першы-другі разлічыся!" — што мы пачуем? А пачуем мы: "Першы!.. Першы!.. Першы!.."

— Мне здаецца, сярод іншага ў вас вельмі добра атрымліваліся фільмы-партрэты. Непараўнальныя, напрыклад, кадры з Шамякіным, калі кінакамера ціхенька сачыла за тым, як ён працуе за пісьмовым сталом...

А ваш фільм "Хроніка знаходжання на Зямлі" пра касманаўта Уладзіміра Кавалёнка... Крытыка тады пісала, што ўпершыню на савецкім экране паказаны будні касманаўтаў — са стратай прытомнасці пасля цэнтрыфугі, з потам, які залівае вочы, з нечалавечай стомленасцю на тварах. Да гэтага мы бачылі толькі святочны бок іх жыцця. Нездарма фільм быў адзначаны Галоўным прызам "Залаты колас" на Усесаюзным кінафестывалі ў Вільнюсе. Наколькі я помню, "Залаты колас" атрымаў тады і Нікіта Міхалкоў — за мастацкім фільм "Радня".

— Здаецца, мы памяняліся ролямі: не я адказваю на пытанні, а вы расказваеце мне пра маю працу. Прыемная нечаканасць...

— Так, сапраўды, я і не заўважыла. Гэта адбылося, мусіць, таму, што фільмы не пакідалі абыякавымі нікога. Скажыце, а як вам жылося на "Летапісе", галоўнай кузні беларускай кінадакументалістыкі!

— Пра наш "Летапіс" трэба гаварыць асобна. Васьмідзесятыя гады былі для студыі спрыяльнымі, цудоўна працавалі разнажанравыя, рознаманерныя, цікавыя рэжысёры.

Маналогі-споведзі — фільмы Віктара Дашука, якія злыя языкі называлі "галовамі, якія гавораць", прынеслі яму і славу, і званні, і даброты жыццёвыя. Тэмпераментныя, яркія спартыўныя фільмы Сяргея Лук'янчыкава цягнулі прызы са шматлікіх фестываляў. Адзін з эстэтызаваных, вытанчаных фільмаў Аляксандра Карпава пабываў на фестывалі ў Аберхаўзене. Заліхвацкія рэпартажы Валодзі Цеслюка выклікалі зайздрасць у калег з іншых студый. Анатоль Алай ужо "выспяваў" у сур'ёзнага рэжысёра...

Многія поспехі былі звязаны з імем Анатоля Кудраўцава, тагачаснага галоўнага рэдактара "Летапісу". Разумны і таленавіты журналіст і пісьменнік, не менш мудры дыпламат, ён быў вымушаны "круціцца" ў жорсткіх ідэалагічных рамках, але тым не менш менавіта пры ім адбылася тая з'ява ў беларускай дакументалістыцы, якую я называю нашым Рэнесансам.

— Рэжысёры, як правіла, не любяць кінакрытыкаў і кіназнаўцаў — пра гэта мне гаварыў, напрыклад, Віктар Тураў. Міхлееў таксама іх не любіць!

— Міхлееў не прачытаў ніводнай "крытычнай" кнігі — акрамя некалькіх абзацаў пра сябе, калі яны ў іх былі. На мой погляд, крытыкаў чытаюць толькі самі крытыкі.

Мне за ўсё маё жыццё было дастаткова "Дзённікаў" Дзігі Вертава, "Карты Пталемея" Герца Франка, таму што гэта пісалі рэжысёры. Вельмі буйныя і разумныя рэжысёры! Я штудзіраваў тэарэтычныя працы Эйзенштэйна з яго дзіўнымі і дакладнымі адкрыццямі, якія тычацца драматургіі коперу, гуку, уласна драматургіі, рэчы, настолькі цяжка дасягальнай, што большасць калег так і не зведваюць яе сутнасці.

Для мяне дакументальнае кіно — гэта мазаічная карціна, якая "склеена" з тысяч каляровых каменьчыкаў, шкла, кавалачкаў бурштыну або металу. У гэтай мазаіцы можа бліснуць і алмаз, і шкло...

— Гэтыя "маляўнічыя" аналогіі, відавочна, вырастаюць з вашай мастацкай прафесіі!

— Магчыма. Але такое бачанне дакументальнага фільма мне дапамагае. Калі я манцірую, то павінен усім нутром старацца, каб кожны каменьчык-кадр знайшоў сваё месца ў карціне. І калі кадр знаходзіць прызначанае яму месца — ты заспакойваешся. А наогул мантаж — працэс магічны.

— Вы былі ў Парыжы і стаялі ў Луўры перад бессмяротнай карцінай. Якое ўражанне ад загадкавай "Моны Лізы"!

— Вельмі моцнае! Карціна вісіць у паўцёмнай запе, на сцяне цёмнага адцення, амаль у адзіноце. Яе ўсмешка, шматвяковая аўра зачароўваюць. Стаіш, як пад гіпнозам...

— А як вы трапілі ў Парыж!

— Па шчасліваму выпадку. Нечакана мне прапанавалі зняць відэафільм пра чарнобыльскіх дзетак, неаднойчы ўжо аперыраваных на шчытападобную залозу. Я зняў гэты фільм як аўтар-аператар, сам падабраў музыку, пра што заўсёды марыў. І назваў яго "Каляровыя сны з чорна-белым фіналам".

Спачатку дзеткі весела расказвалі пра свае падарожжы па Еўропе: некаму падабаецца бой быкоў у Іспаніі, некаму — блакітная Адрыятыка, горныя курорты Італіі ці нямецкія сасіскі. Карацей — ідылія.

А потым мы чуем пра іх сны і бачым іх малюнкі. І тут — усяленскі смутак. Там быў малюнак хлопчыка: Беларусь, падобная на кляновы ліст, ляжыць на бальнічным ложку пад капельніцай. Так моцна прыдумана! Не, гэта не прыдумаеш. Гэта яму падалося: прыгавораная Радзіма.

Дык вось, гэты фільм атрымаў Галоўны прыз на Міжнародным фестывалі ў Гомелі. Уручылі, як трэба, вялізную вазу, кветкі. І раптам падыходзіць сімпатычны малады чалавек — як потым высветлілася, дырэктар турыстычнага агенцтва "Грантур", і ўручае сціплы канверцік, а ў ім: "Паважаны спадар Міхлееў, "Грантур" мае гонар запрасіць Вас у паездку ў Парыж у зручны для Вас час".

Уяўляеце? Я даўно страціў надзею ўбачыць гэты горад. Я яго ведаў, можна казаць, на памяць. Па літаратуры, альбомах, Хэмінгуэю, і на табе — Бог даў! Дзесяць дзён бясплатнай паездкі, цудоўная праграма: Версаль, музей Радэна, Музей сучаснага мастацтва з яго Сезанам, Дэга, Луўр, дзе няма ніводнай копіі. Прагулкі па бурштынавым ад восені горадзе...

— І як жа было вяртацца!

— Я не паспеў захварэць на настальгію. Пасля разліваў святла Елісейскіх палёў, якія сцякаюць уніз ад Трыумфальнай аркі, тут было цёмна. Месяцы два я хадзіў і ціха ўсміхаўся. Знаёмыя спачувальна пазіралі: маўляў, нешта ў мужыка з галавой. А я заплюшчваў вочы і зноў апынаўся ў цэнтры "свята, якое заўсёды з табой".

— На жаль, будні даўжэйшыя за святы... Як вам жывецца ў нашых сённяшніх буднях!

— Мне лягчэй: прафесій шмат...

— Нешта мы з вамі засумавалі пад канец... Будзем спадзявацца, што і "Беларусьфільм" зноў ажыве...

— Прарвёмся. Няхай будзе так.

Гутарыла **Святлана БАРТОХАВА.**

Заканчэнне.
Пачатак у №№ 43—44.

ВЫСТАВЫ

У галерэі "Прырода і творчасць" Рэспубліканскага дзіцячага экалагічнага цэнтра адкрылася выстава "Пад небам Коласа". Такім чынам Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа распачаў шэраг мерапрыемстваў па святкаванні 120-годдзя з дня нараджэння песняра, якое адбудзецца ў наступным годзе.

ПАД НЕБАМ КОЛАСА

Аснову выставы склалі палотны вядомага беларускага мастака Уладзіміра Сулкоўскага, які больш за дваццаць гадоў працуе над коласаўскай тэмай. Значная частка яго прац — мастацкая рэканструкцыя. А гэта значыць, каб аднавіць даўно не існуючыя пабудовы, звязаныя з жыццём і творчасцю Коласа, мастаку спатрэбілася грунтоўна папрацаваць у архівах. Выступаючы на адкрыцці выставы, намеснік старшыні Саюза мастакоў Беларусі Уладзімір Басалыга назваў працу свайго калегі мастацкім подзвігам. І сапраўды, колькі пошуку, колькі дарог адмерана пешшу і на веласіпедзе, колькі апытана старых людзей, якія памятаюць каштоўныя для мастака дробязі. І ўсё дзеля таго, каб мы сёння маглі далучыцца да прыгажосці Панямоння, адчуць тую атмасферу, якая дала Коласу творчае натхненне. Разам з мастаком мы маем магчымасць зазірнуць у Акінчыцы і Альбуць, завітаць у Ласток і падняцца на Высокі бераг, адкуль адкрываюцца прасторы Прынямоння.

Не менш цікавая і дакументальная частка выставы, падрыхтаваная супрацоўнікамі коласаўскага музея. Фатаграфіі і кнігі, асабістыя рэчы паэта ў спалучэнні з мастацкімі палотнамі ствараюць уяўленне аб жыцці Якуба Коласа.

На выставе гучалі вершы песняра і песні, прывезеныя на вернісаж землякамі паэта са Стаўбцоўшчыны.

НА ЗДЫМКАХ: на адкрыцці выставы: дырэктар коласаўскага музея Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ, малодшы сын песняра Міхась МІЦКЕВІЧ і мастак Уладзімір СУЛКОЎСКІ; творы мастака "Высокі бераг" і "Мікалаеўская лясная камора".

Тэкст і фота
Яўгена КАЗЮЛІ.

НАТАТКІ Яўгена ЛЕЦКІ

Вярта

Беларусь часам называюць краінай замкаў. З пэўнай доляй умоўнасці, вядома. Бо не так ужо і шмат ацалела на нашай зямлі з таго, што колісь мелася. І наўрад ці калі будзе адбудавана ўсё, што разбурана часам і людзьмі. Гэта і немагчыма, дый, бадай, і непатрэбна. Але грамадзяне краіны павінны ведаць сваю гісторыю. А яе ствараюць людзі, зробленае якімі шмат стагоддзяў назад і сёння кранае запаветныя струны нашай душы. Бо хіба ж мы не сцішваемся ў радасным трымценні пад гукі мелодыі славутага паланеза, вядомага пад назвай "Развітанне з Радзімай?" Нездарма ж у першай палове 90-х, калі аб'яўляўся конкурс на гімн незалежнай Рэспублікі Беларусь, музыка, створаная дзвесце гадоў назад, прызнавалася і для нашага часу надзвычай актуальнай. Аднаго такога твора дастаткова, каб навечна замацавацца ў духоўнай гісторыі свайго народа.

Між тым музычная спадчына Міхала Клеафаса Агінскага, пра якога тут размова, вельмі абсяжная. У маладыя гады ён атрымаў выдатную музычную адукацыю, але ягоны кампазітарскі дар па-належнаму раскрыўся падчас усенароднага ўзрушэння, калі на землях Беларусі, Літвы і Польшчы спакваля набрыньваў, а потым выбухнуў паўстаннем пратэст пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, у якім Агінскі ўзяў самы чынны ўдзел. І са зброяй у руках як камандзір паўстанчай залогі, і як кампазітар, аўтар шматлікіх маршаў і баявых песень. Доўгі час лічылася, што нацыянальны польскі гімн "Ешче Польска не згінэла" (словы Выбіцкага) створаны на народную музыку, але ўжо даказана, найперш дзякуючы даследаванню Анджэя Залускага, што належыць яна прафесіяналу высокага класа, а менавіта нашаму земляку Міхалу Клеафасу Агінскаму.

Сваімі каранямі Агінскія сягаюць у сівую даўніну і бяруць пачатак ад Рурыкавічаў. З княжацкага роду герба "Брама" ("Агінец") выйшла шмат славутых людзей, якія займалі ключавыя пасады ў Вялікім княстве Літоўскім. Дзейнасць Міхала Клеафаса прыпадае на час, калі беларуская дзяржава ў якасці саюзнай злучылася з Польшчай, а потым разам з ёю ўвайшла ў склад Расійскай імперыі. Аднак мара пра аднаўленне ўласнай дзяржаўнасці была ўласцівая лепшым людзям Беларусі, у тым ліку і прадстаўнікам вышэйшага магнацкага стану, да якога належалі Агінскія.

Жыццё і дзейнасць Міхала Клеафаса цесна пароднена з лёсам ягонага дзядзькі Міхала Казіміра Агінскага. Яны былі не проста сваякамі, але душэўна, духоўна і светапоглядна вельмі блізкімі людзьмі. Старэйшы з іх (1730—1800) яшчэ заспеў час, калі Вялікае княства Літоўскае ў межах саюзнай дзяржавы захоўвала сваю выразную самастойнасць, пры якой Міхал Казімір займаў такія ключавыя пасады, як ваявода віленскі, гетман вялікі літоўскі. Ён быў адным з кандыдатаў на трон Рэчы Паспалітай, уплывовым военачальнікам. Аднак ягонае 3-тысячнае войска пацярпела паражэнне ад узначаленай А. Суворавым армады. Ад пакарання ўратавала эміграцыя. Але праз пэўны час быў памілаваны, вярнуўся на радзіму і вярнуў сабе секвестраваныя маёнткі. Жыў у Слоніме, дзе адкрыў некалькі прадпрыемстваў, друкарню, заснаваў адзін з лепшых для свайго часу ў Еўропе тэатр і капэлу. На свае сродкі пабудаваў Агінскі канал. Вядомасць здабыў таксама як аўтар музычных і літаратурных твораў. Пра значнасць яго духоўнай спадчыны апавядаецца ў кнізе А. Цеханавецкага "Міхал Казімір Агінскі і яго "сядзіба музаў" у Слоніме", якая ў перакладзе з нямецкай на беларускую мову выдадзена ў 1993 годзе ў Мінску.

Падобнай няпростай, нават пакручастай жыццёвай дарогай ішоў і ягоны пляменнік Міхал Клеафас Агінскі (1765—1833). Маючы, як і дзядзька, выдатныя здольнасці, Міхал Клеафас замалада працаваў надзвычайным паслом у Галандыі, потым выконваў важную дыпламатычную місію як афіцыйная асоба Рэчы Паспалітай у Лондане. Пасля страты гэтай краінай дзяржаўнасці ў 1791 годзе прысягнуў у Магілёве на вернасць Кацярыне II, але падтрымаў Канстытуцыю 3 мая гэтага ж года, якая прадугледжвала аднаўленне польскай дзяржаўнасці, і выступіў на баку нацыянальна-вызваленчага руху. Пасля паражэння эмігрыраваў у Прусію. Але пакаяўся і вярнуўся назад. Займаў адказныя пасады, у тым ліку падскарбія літоўскага, ці, кажучы сучаснай мовай, міністра фінансаў. Але тут выбухнула паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, і Міхал Клеафас на ўласныя сродкі стварыў батальён стралкоў, на чале якога ўдзельнічаў у баявых дзеяннях.

Пасля задушэння паўстання жыў за мяжой, потым быў памілаваны і вярнуўся ў маёнтак Залессе, дзе, як і ягоны дзядзька ў Слоніме, займаўся актыўнай культурніцкай дзейнасцю, у выніку чаго правінцыяльнае мястэчка здабыло славу "паўночных Афін". Побач з гэтым уключыўся і ў дзяржаўную дзейнасць, за што ў 1910 годзе атрымаў высокае званне сенатара, чын тайнага саветніка, а ў наступным на імя імператара Аляксандра I падаў праект аднаўлення Вялікага княства Літоўскага ў складзе Расійскай імперыі з уключэннем у аўтаномію Гродзенскай, Віленскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Падольскай, Валынскай губерняў, Беластоцкай вобласці і Цярнопальскай акругі са сталіцай у Вільні. Планавалася склікаць сойм, вышэйшы заканадаўчы орган краю, увесці Канстытуцыю і паступова скасаваць прыгоннае права. Ліберальны імператар быў згодны падтрымаць гэты праект, асабліва з улікам палітыкі Напалеона, аднак кансерватыўныя колы ўбачылі ў ім пагрозу цэласнасці імперыі, і план быў адхілены. Пэўныя прывілеі край, а найперш шляхта усё ж атрымалі. Сам жа М. К. Агінскі за сваю дзейнасць на карысць Расіі ўзнагароджаны ордэнамі св. Уладзіміра і Аляксандра Неўскага.

Бадай, усё гэта, а найбольш няпэўнасць, а мо нават і несур'ёзнасць стаўлення Напалеона да праблемы аднаўлення дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага, з якім на гэты конт вяліся перамовы, паспрыяла таму, што Агінскія, як дарэчы і Тадэвуш Касцюшка, у вайне 1812 года не выступілі на баку французскага войска. Аднак і ад Расійскай імперыі прыхільнікі беларуска-літоўскай дзяржаўнасці ніякіх рэальных крокаў у гэтым кірунку не дачакаліся. І гэта, мабыць, было адной з прычын таго, што Міхал Клеафас вырашыў назаўсёды развітацца з Радзімай і ў 1823 годзе паехаў у Італію.

На выбар краіны пражывання мо паспрыяла і тое, што ягонай другой жонкай была італьянка. Цікава, што Марыя Нэры разам з трыма дзецьмі засталася пэўны час жыць у Завоссі без мужа. Міхал Клеафас атабарыўся ў Фларэнцыі. Займаўся пераважна літаратурнай дзейнасцю. У выніку ў Парыжы на французскай мове выдаў 4-томныя "Мемуары пра Польшчу і палякаў з 1788 да 1815 г." Таксама напісаў кнігу "Лісты пра музыку", выдадзеную па-польску ў 1956 годзе.

ЗАХАВАЙ ТРАДЫЦЫЮ

ДЗЯДЫ

Памяні, Бог, хто ў яме,
Паздароў, Бог, хто з намі!
Памяні, Божачка,
душачку іх,
Царства ім нябеснае!

Дзяды — штогадовыя памінанні продкаў у сям'і і сваім родзе.

У каталіцкай частцы нашага насельніцтва такое памінанне продкаў — так званы Дзень задушны адбываецца адзін раз у год — 2 лістапада.

У праваслаўных Дзяды праводзяцца тройчы на год: зімою — Дзяды масленічныя, або мясаедаўскія, улетку — Дзяды сёмушныя і ўвосень — Дзяды восеньскія. Іх называюць яшчэ "бацькоўскімі суботамі", бо яны прымеркаваны да шостага дня тыдня.

Сёмушныя, або духаўскія, Дзяды святкуюцца ў суботу напярэдадні Сёмухі. У большасці рэгіёнаў іх называюць стаўроўскімі. Пра паходжанне стаўроўскіх Дзядоў апавядае легенда: "Над ракой Дрысай некалі быў хутар Краснаполь, акружаны з усіх бакоў густым старым лесам. Каля Краснаполя жыў багаты князь, які любіў паляваць з лукам і стрэламі. Былі ў яго два верныя сабакі Стаўры і Гаўры. Калі яны памерлі, князь у іх гонар прызначыў штогадовыя памінанні".

Як адзначаюць многія фалькларысты і этнографы XIX і пачатку XX стагоддзяў, пачыналіся стаўроўскія Дзяды з таго, што гаспадар пасля малення заглядваў пад стол і клікаў: *"Стаўры, Гаўры, гам! Прыходзьце к нам!"*

Восеньскія Дзяды, або Асяніны, самыя гапоўныя ў цыкле памінальных дзён. Іх правядзенне — своеасаблівая падзяка духам продкаў за атрыманы ўраджай, дабрабыт. Адзначаюцца Дзяды ў лістападзе, але ў розных рэгіёнах у розныя дні.

На поўдні Міншчыны, пераважна ў Магілёўскай вобласці і ў паўночных рэгіёнах Гомельшчыны восеньскія Дзяды прымяркоўваюцца да суботы напярэдадні Піліпаўкі (28 лістапада), на Віцебшчыне, у цэнтральных і паўночных раёнах Міншчыны, некаторых рэгіёнах Магілёўшчыны восеньскія памінкі продкаў адзначаюцца перад днём Дзмітрыя Славунскага — у Змітраўскую суботу (8 лістапада).

Па павер'ях, на Дзяды памерлыя наведваюць сваіх родных і блізкіх. Таму ў кожнай хаце людзі рыхтавалі ежу, чыста мылі падлогу, у двары пасыпалі жоўтым пясочкам. Абавязкова гатавалі кашу (куццю), блінцы, каўбасы, галушкі. З абеду грэлі лазню і вечарам ішлі мыцца. Апраналіся ў чыстае святочнае адзенне, запальвалі свечку і маліліся за душы памерлых. Пасля малення ўсе падыходзілі да стала, але, перш чым сесці самім, запрашалі зрабіць гэта "дзядоў-радзіцеляў": *"Прыходзьце, дзяды-радзіцелі, і старыя і малыя, хто на гэтай сялібе жываў, хлеба-солі ядаў. Прыходзьце, дзяды-радзіцелі, к свайму сталу, к нашаму прыпечку!"*

Для Дзядоў ставілі на стол талерку і клалі ежу. Пасля вячэры ўсе ішлі спаць, але са стала нічога не прымалі, каб продкі працягвалі частавацца.

У Рагачоўскім раёне Гомельскай вобласці ёсць павер'е: калі хто хоча пабачыць нябожчыкаў, трэба тры дні з чацвярга да дзедаўскай суботы пасціцца — нічога не есці, не піць і не размаўляць. У дзедаву суботу трэба залезці на печ і цэлы дзень выглядаць у хату з-за коміна. Той, хто гэта выконваў, вечарам бачыў, як у хату са свечкамі заходзілі знаёмыя і незнаёмыя і сядалі за стол.

"Хто Дзядоў не ўважаець, таму ўсяляк бываець".

"На Сёмуху май спраўляюць, Дзядоў памінаюць".

Падрыхтаваў **Мікола КОТАЎ.**

НЕ НАЗАЎСЁДЫ

Міхала Клеафаса пахавалі ў Фларэнцыі часцёле Санта Марыя праз 10 гадоў пасля ўкапліцы-пантэоне ў часцёле Санта Крочэ, дзе ве... сном спачываюць... Італіі: Мікеланджэла, Дантэ, Расіні ды іншыя...

Пра спыннага земляка... вялікая літаратурная... розных мовах. Ж... грамадскай... дзейнасць асэнсаваны... І. Бэлзы "Михал Клеофас Агінский", 2-е выданне якога... 1974 г... у Маскве ў... найбольш поўна, ро... Агінова і пранікнёна, бадай... Польшчы выдадзенай у... Польшчы... Анджэя Залускага... якога па жаночай лініі, (сястры... апрабабкі Амеліі ад Агінскага... Клеафаса), ідзе...

Асобнік... пазітара, раманты... жыцця, спалучаны... ройкай змагання, кроўны... з Беларуссю, яго нязмен... "утэшы" патрыятызм... не прывабіць дзеячаў бе... культуры. А. К. Агінскі... свечана эсэ Уладзіміра... Караткевіча "Песня Паўдня".

Міхала Клеафаса пахавалі ў

ВАНДРОЎНЫЯ БЫЛІ

СТОПАМ НА БРАНІ

У першы вечар вандроўкі, калі турысты спыняюцца на месцы, якое падалося найбольш зручным для начлегу, калі ставяць намёты і гатуюць вячэру, калі змяркаецца, змаўкаюць птушкі ў чорным лесе, не гудуць камары, а на небе заззяюць зоры, адчуваецца прыўзняты бадзёры настрой. У такі вечар валацугі, якія гуртуюцца вакол вогнішча, на якім закіпае гарбата, бываюць асабліва шчырымі і распавядаюць пра цікавыя здарэнні са свайго жыцця.

Спрактыкаваныя турысты ведаюць, што такі ўзнёслы вечар больш не паўторыцца за ўсё падарожжа, што хутка падарожнікі прывыкнуць адзін да аднаго і ўжо не будуць так уважліва прыслухоўвацца да чужых расповедаў. Таму пераважна толькі ў першы вечар гучаць ля вогнішча самыя шчырыя і цікавыя гісторыі.

У такі вечар, падчас вандроўкі да возера Дзічкі недалёка ад знакамітага беларускага Заслаўя; мы сталі прыгадваць, хто як з нас падарожнічаў стопам.

Хлопец па мянушцы Батон распавёў, як ехаў стопам да расійскага Санкт-Пецярбурга, мой сябра Барыс Касачэўскі — як стопам праехаў усю Польшчу, я прыгадаў, як ехаў стопам ад Лепеля, што на Віцебшчыне, а ля маёй скроні звар'яцелы вадзіцель трымаў пістапет. А мой знаёмы Ігар па мянушцы Жалезны Дрывасек сказаў, што сапраўдны смак ад падарожжа стопам ён адчуў у мангольскім стэпе, дзе ехаў на брані танка.

І распавёў пра гэтае здарэнне з часоў сваёй ранняй маладосці, падсілкоўваючыся гарбатай са згушчаным малаком.

Саракагадовага высокага хударлявага Ігара мы называлі Жалезным Дрывасекам за тое, што, як толькі наша суполка спынялася на начлег, ён выцягваў з заплечніка доўгую сякеру з жалезнай дзяржальняй ды не супакойваўся, пакуль не насячэ кучу дроў. Звычайна ад яго сякеры лес дрыжаў. Ну хіба не Жалезны Дрывасек — герой яго любімай у дзяцінстве кніжкі "Чараўнік Ізумруднага горада"? Тым больш, Ігар не крыўдаваў на сваю мянушку...

У юнацтве Ігар і не думаў, што вырасце заўзятым турыстам-паходнікам, самае далёкае, куды выязджаў тады, — на бацькоўскае лецішча ды з сябрамі на пікнікі. А потым юнацтва скончылася, прыспела пара ісці ў войска. Тады яшчэ існаваў Савецкі Саюз,

Савецкая Армія кантралявала тэрыторыю прылеглых сацыялістычных краін. Ігара накіравалі служыць далёка ад Беларусі — у Манголію, у танкавую часць, якая месцілася паміж гарадамі Чулун-Харот і Чойбалсан: ад Масквы туды ехалі на цягніку пяць сутак ды яшчэ колькі гадзін — на машынах ад чыгункі.

У першыя паўгода службы ў Манголіі Ігару не тое, што падарожнічаць — жыць не хацелася. Яму здавалася, што патрапіў у пекла. Здавалася, што ад бязлітаснага сонца вось-вось пачне крышыцца бетон на плацы ды расплавяцца танкі. А вакол сноўдалі стараслужачыя — чэрці ў чалавечым абліччы, якія так здзекаваліся з навабранцаў, што Ігар штовечар думаў: а ці не павесіцца яму? Толькі дзе ж павесішся, калі вакол часці — стэп, ніводнага дрэўца?

Праз год Ігара адпусцілі ў адпачынак дадому. Да чыгункі яго павезлі на танку. Не гнаць жа машыну з-за нейкага радавога! А танкісты павінны наездзіць пэўную колькасць кіламетраў, каб не страціць баявых навыкаў. Паліва на той час у Савецкай Арміі не эканомілі.

Седзячы на вежы, Ігар, схіліўшы галаву, пазіраў на зялёную пыльную браню, адчуваючы адно млявую стому.

Танк пад'ехаў усутыч да рэек. Пасажырскі цягнік, які курсіраваў паміж Чойбалсанам і Чулун-Харотам, не спыняўся ў стэпе, тым больш, з-за нейкага там савецкага жаўнера. Здалёк заўважыўшы танк, вадзіцель цягніка толькі прымарудзіў рух.

Счакаўшы момант, Ігар пераскочыў з танка ў дзвярны праём вагона, які праплываў міма. Дзвярэй і шыбаў на вокнах мангольскіх вагонаў не было, інакш пасажыры задыхнуліся б ад спякоты.

Вярнуцца Ігар павінен быў такім жа чынам: выскачыць з вагона на танк, які меўся чакаць яго на тым жа месцы.

І вось праз месяц, па дарозе з Чойбалсана ў Чулун-Харот, хлопец выглядваў з акна вагона свой танк у спякотным стэпе ды няўважліва прыслухоўваўся да размоў афіцэраў у суседнім купэ: тыя распівалі каньяк і абмяркоўвалі нядаўнюю просьбу Манголіі далучыцца да Савецкага Саюза шаснаццатай рэспублікай. Адзін афіцэр, які часта паўтараў, што едзе з самай Чыты, гучна абураўся — як наогул будаваць сацыялізм у Манголіі, якая дагэтуль не пазбавілася феадалізму?..

Убачыўшы нарэшце танк, які ўсутыч пад'ехаў да рэек, Ігар выбег у тамбур і пераскочыў з вагона на танкавую браню.

І толькі, калі цягнік ад'ехаў, заўважыў, што трапіў не на тую машыну — на вежы былі намаляваны распазнавальныя знакі іншай танкавай часці.

— Ты хто такі? — здзівіўся вадзіцель танка, які высунуў з люка перапэцканы мазутам твар. — Мы чакаем афіцэра з Чыты...

— Пэўна, гэта той афіцэр, які зараз п'е каньяк, — паказаў Ігар у бок далёкага цягніка. — У яго не было часу ў акно паглядзець. Ён вырашаў, якім чынам будзе сацыялізм будаваць у Манголіі. А ці далёка адсюль да маёй ваеннай часці?

— Кіламетраў семдзесят, — паспачуваў вадзіцель танка. — Як ты дапенцюхаеш туды па стэпе — не ўяўляю.

— А не падвезяце? — спытаў Ігар.

На мазутным твары вадзіцеля з'явіўся заклапочаны выраз.

— Ды ў нас паліва не хопіць... — задумліва прыкінуў ён.

Ігар дастаў з заплечніка дзве бутэлькі гарэлкі і працягнуў.

— А калі гэтае паліва заліць куды трэба? — спытаў ён.

— Зальём, — запэўніў танкіст. — Хопіць. Трымайся.

Ігар ускараскаўся на вежу, паклаў заплечнік на гарачую браню і сеў на яго, "асядлаўшы" ствол гарматы.

Так ён і ехаў стопам на танкавай брані па стэпэ. І толькі цяпер заўважыў, у якіх прыгожых мясцінах выпала яму служыць. Ён у захапленні пазіраў на чыстае неба, якое ружавела ад промняў ранішняга сонца, на бязводныя раўніны, замеценыя шоўкавым жоўта-чырвоным пяском, на шэра-зялёныя ўзвышшы, над якімі тырчэлі далёкія белыя скалы, падобныя ці то да звяроў, ці то да людзей.

Сонца, то знікаючы за шлейфам пылу, то рассякаючы яго прамянямі, пакрысе паднімалася, — цень ад танка, які ламаным сілуэтам плыў па ўзгорках побач з гусеніцамі, скарачаўся ў даўжыню. Сонца прыпякала. Ігар ведаў, што, пакуль даедзе да часці, з яго, як кажуць, сыдзе сем патоў. Але ведаў і тое, што пот хутка забудзецца, як і ўсё непрыемнае, а гэтая прыгажосць запомніцца назаўсёды.

Падчас той язды на танку Ігара асяніла: вось чаго на самай справе ён прагнуў у юнацтве — руху ў прыгожай прасторы! Яму наканавана падарожнічаць, ён не народжаны доўга заставацца на адным месцы! І менавіта тады Ігар вырашыў, што больш не будзе чакаць, пакуль нехта зноў падорыць яму гэтую прыгажосць, пакуль нехта пакліча ў падарожжа. Сам будзе шукаць спадарожнікаў і планаваць маршруты! Бо галоўнае для яго — не спыняцца, рухацца, спазнаваць чароўны свет вакол сябе...

— І калі я спасціг гэтую ісціну, — заключыў Ігар, — то зразумеў, што ўсё было недарэмна.

— Што менавіта? — удакладніў я.

— Ну, усе непрыемнасці ў жыцці, усё было недарэмным. Бо ўсё гэта рыхтавала мяне да таго, каб спазнаць сваю існасць. Я перажыў дзедаўшчыну ў Манголіі, каб на ўласныя вочы пераканацца, як шалеюць людзі, калі доўгі час знаходзяцца на адным месцы. Калі б не пераканаўся, пэўна, дагэтуль не зразумеў бы, што павінен рухацца, падарожнічаць. Вось з таго часу і падарожнічаю стопам. І куды толькі не заязджаў! І заўсёды знаходзяцца спадарожнікі! Таму — усё было перажыта недарэмна.

Скончыўшы свой расповед на ўзнёслай ноце, ён кінуў у вогнішча апусцелую банку, на што я сыранізаваў:

— Перажываў ты і падарожнічаў стопам на танку, можа, і недарэмна. А вось банку згушчанага малака ты "апрыходаваў" дарэмна. Больш у нас нічога салодкага не засталося...

Ягор КОНЕЎ.

Малюнак **Вячаслава ІГНАЦЕНКІ.**

АСПЕКТ ПРАБЛЕМЫ

ХТО БУДУЕ «ЮЛІН ДОМ»?

Яны непадобныя да нас. Яны маленькія і безабаронныя. І калі людзі самі выбіраюць сабе лёс, то іх жыццё залежыць ад нас, двуногіх. Яны верныя сябры і ніколі не хістаюцца, што ім рабіць: абараніць свайго сябра-гаспадара ці выратоўваць сваю шкуру. Людзі, хто вас пашкадуе, калі вам баліць, хто вас абароніць, калі бяда, хто беспамылкова адчуе ваш дрэнны настрой, нават калі на вашым твары ўсмешка? Яны. Нашы браты меншыя, якім патрэбна дробязь — наш клопат.

На Беларусі, а дакладней, у Мінску, існуе каля дзесятка грамадскіх арганізацый аховы жывёл. Самыя вялікія з іх — "Каштанка" і "Ратаванне". Калі браць абласныя цэнтры, такія арганізацыі існуюць толькі ў Магілёве і Гомелі.

Кожны год толькі ў Мінску гіне 11—12 тысяч бяздомных сабак і кошак. Вельмі часта ў іх лік трапляюць і жывёлы, якія маюць гаспадароў, але проста згубіліся. І адзіны аргумент той, што няма дзе іх утрымліваць на працягу пяці дзён, як гэта патрабуе пастанова Савета Міністраў "Аб зацвярджэнні правілаў захоўвання хатніх жывёл у населеных пунктах".

Грамадскія арганізацыі аховы жывёл звяртаюць увагу на гэту праблему. Яе рашэннем можа стаць будаўніцтва ў Мінску прытулку для бяздомных жывёл, які б змяшчаў у сабе вальеры для сабак і кошак, а таксама медыцынскія кабінеты, дзе б стэрылізаваліся жывёлы. Бо гэта адзіны гуманны шлях зніжэння колькасці непародных бяздомных жывёл. Будаўніцтва такога дома распачалося ў верасні 2000 года, але пры існуючых тэмпах фінансавання (гэта маленькі працэнт ад збору падаткаў на ўтрыманне сабак) зацягнецца яшчэ не на адзін год.

Мэтай гэтых арганізацый стала таксама прапаганда гуманных адносін людзей да бяздомных жывёл. Актывісты руху аховы жывёл выступаюць у газетах, па радыё і тэлебачанні, праводзяць лекцыі ў школах, імкнуцца выхоўваць у людзей адказнасць за тых, каго прыручылі.

Валанцёры, а гэта проста студэнты, пенсіянеры, служачыя, якія маюць толькі адно — міласэрнасць да бяздомных жывёл, падбіраюць іх на вуліцах і знаходзяць ім гаспадароў.

"Ратаванне" стварыла ў 2000 годзе і зараз працягвае выпуск газеты "Ратаванне", якая распаўсюджваецца бясплатна і разлічана на тое, каб данесці да ўсіх людзей ідэі арганізацыі.

У кастрычніку ў Сусветны дзень жывёл у Палацы культуры чыгуначнікаў прайшоў канцэрт майстроў беларускай эстрады ў рамках дабрачыннай акцыі "Юлін дом" пад патранажам грамадскага руху абароны жывёл "Каштанка". Гэта акцыя праводзілася з мэтай звярнуць увагу на праблему бяздомных жывёл. Бо з іх бяздомнасцю цесна звязана і іншая праблема — шаленства, хвароба, якая перадаецца чалавеку ад жывёлы. Толькі за сем месяцаў 2001 года ў сталіцы зарэгістравана каля 340 такіх выпадкаў.

На канцэрт былі запрошаны дзеці і іх бацькі. Нечакана для ўсіх перад канцэртам юная спявачка Юленька Данькова звярнулася да прысутных з паведамленнем, што перад канцэртам да Палаца чыгуначнікаў падышоў мужчына і сказаў, што знайшоў маленькае кацяня, і папрасіў яго ўладкаваць. Кацяня карабкалася па руках дзяўчынкі, а з залы... ніхто не падняўся і не выказаў жадання яго забраць...

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, ЗМЕШЧАНУЮ Ў № 43

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ. 1. Хлюпік. 5. Мічман. 7. Апала. 9. Кабрыялет. 13. Цымус. 14. Давер. 16. Адбор. 19. Нарыс. 20. Матор. 21. Карма. 22. Абрус. 24. Солад. 26. Факір. 28. Фауна. 29. Экземпляр. 31. Калье. 32. Сцежка. 33. Фатыга.

ПА ВЕРТЫКАЛІ. 2. Пракос. 3. Карбід. 4. Кары. 5. Махляр. 6. Чыстка. 8. Шаман. 10. Табар. 11. Сцюардэса. 12. Ардынарац. 15. Вылюдак. 17. Рыфма. 18. Шайба. 21. Калос. 23. Сауна. 25. Дрэнаж. 26. Фізіка. 27. Рэльеф. 28. Фармат. 30. Міля.

«Голас Радзімы»

Галоўны рэдактар
Наталля САЛУК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь; Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі; Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом "Радзіма".

РЭДАКЦЫЯ:
Намеснік галоўнага рэдактара
Галіна УЛІЦЁНАК.
Адказны сакратар
Таццяна КУВАРЫНА.
Рэдактар аддзела — член рэдкалегіі
Яўген ЛЕЦКА.
Рэдактар аддзела
Алена СПАСЮК.
Аглядальнік
Віктар МАЦЮШЭНКА.
Спецыяльныя карэспандэнты
Яўген КАЗЮЛЯ,
Алесь МЯСНІКОЎ,
Нэлі ПРЫВАЛАВА.
Рэдактар-перакладчык
Святлана КАРПУЧОК.
Стыльрэдактар
Ірына КАЗЛОВА.
Тэхнічны рэдактар
Данута РАКАВЕЦ.

Наш адрас: 220005, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 213-31-97 (тэл.-факс), 213-32-80, 284-76-56, 213-37-82.

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», не заўсёды супадаюць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 81.
Падпісны індэкс у Беларусі 63854.
Тыраж 2 044 экз.
Зак. 2756.
Падпісана да друку 5.11.2001 г. у 12.00.

Газета набрана, звярстана і аддрукавана ў друкарні «Беларускі Дом друку». (220041, г. Мінск, пр. Скарыны, 77).